3. Чурко, Ю. М. Хореография в зеркале критики / Ю. М. Чурко. – Минск : Бел. гос. ун-т культуры и искусств, 2010. – 356 с.

**Арабей Д.С., Казачкова В.А.,** студэнты
Навуковы кіраўнік – Байко А.П.

## СУЧАСНЫЯ ТЭНДЭНЦЫІ АРГАНІЗАЦЫІ ЦЫРЫМОНІЙ АДКРЫЦЦЯ І ЗАКРЫЦЦЯ МАШТАБНЫХ СПАРТЫЎНА-ВІДОВІШЧНЫХ МЕРАПРЫЕМСТВАЎ

Алімпійскія гульні – найбуйнейшыя міжнародныя комплексныя спартыўныя спаборніцтвы, якія праводзяцца кожныя чатыры гады. З першых сучасных Алімпійскіх Гульняў, якія праводзіліся ў Афінах (1896) афіцыйныя цырымоніі адкрыцця і закрыцця былі важнай часткай Алімпійскіх гульняў. А асноўным патрабаванне, якое ставіцца перад арганізатарамі ўрачыстых цырымоній адкрыцця і закрыцця спартыўна-відовішчных мерапрыемстваў у тым ліку спартакіяд, Сусветных фестываляў моладзі і студэнтаў, Алімпійскіх гульняў, Гульняў добрай волі г.д. з'яўляецца іх відовішчнасць. Кожная цырымонія адкрыцця складаецца з афіцыйных пратаколаў, якія распрацоўваюцца пад кіраўніцтвам Міжнароднага Алімпійскага Камітэта (МАК), а таксама з мастацкай ці культурнай часткі, якія з'яўляюцца прадуктам творчасці і ініцыятывы кожнага Арганізацыйнага камітэта Гульняў [4]. Тэарэтычным асновам рэжысуры спартыўна-відовішчных мерапрыемстваў прысвечаны працы Д.М. Генкіна ―Масавыя святы”, Б.М. Пятрова ―Станаўленне і развіццё рэжысуры прадстаўленняў” [0], Ю.М. Чарняк ―Рэжысура свят і відовішчаў” [3].

Упершыню элементы мясцовай культуры прысутнічалі ў алімпійскіх цырымоніях на Гульнях 1932 г., а ў 1936 г. былі ўведзены больш складаныя музыка, танцы, і прадстаўленні. Сёння нацыянальныя культурныя элементы і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мясцовы каларыт сталі яшчэ больш прыкметнымі і маюць вялікае значэнне для цырымоній адкрыцця і закрыцця. Самі цырымоніі адкрыцця і закрыцця Алімпійскіх гульняў з кожным годам становяцца больш маштабнымі, што цягне за сабой рост бюджэту на арганізацыю шоу. Арганізатары кожных наступных Гульняў імкнуцца уразіць папярэднія, таму да распрацоўкі і рэалізацыі сцэнарыяў цырымоній прыцягваюцца лепшыя пастаноўшчыкі, рэжысёры, сцэнарысты, спецыялісты па спецэфектах. Абавязковым стаў удзел сусветна вядомых зорак шоў-бізнэсу, акцёраў, музыкантаў, топ-мадэляў у пастаноўках [2].

Мы прадставілі рэтраспектыўны аналіз найбольш ўражлівых цырымоніі зімовых Алімпіяд мінулых гадоў. У 1960 г. у Скво-Вэлі (ЗША) на гэтых Гульнях здзейснілі рэвалюцыю ў трансляцыі спартыўных спаборніцтваў: тут нарадзілася ідэя тэлевізійнага паўтору момантаў і ўпершыню з'явілася магчымасць паказваць карцінку ў запаволеным прайграванні. Арганізатарам мерапрыемства выступіў найвядомейшы галівудскі дзеяч – Уолт Дысней. І менавіта тут упершыню быў выкананы Алімпійскі гімн, зацверджаны МАК у 1958 годзе.

У 1988 г. у Калгары (Канада) у цырымоніі адкрыцця ўдзельнічалі прафесійныя спартсмены, мясцовыя энтузіясты і спецыяльнае падраздзяленне каралеўскіх гвардзейцаў, а алімпійскі агонь шугаў у спецыяльна пабудаваным вігваме. Талісманам XV зімовай Алімпіяды сталі палярныя медзведзяняты «Хайдзі і Хоўдзі» – гэта першы парны талісман. Варта заўважыць, што менавіта Алімпіяда ў Калгары упершыню для зімовых Гульняў стала прыбытковай.

Зімовая Алімпіяда 1992 г. у Альбервілі (Францыя), сабрала рэкордную колькасць удзельнікаў за ўсю гісторыю зімовых Гульняў - 1801 спартсмены з 64 краін. Менавіта на гэтых Гульнях ўпершыню алімпійскія спаборніцтвы атрымалі 16-дзённы фармат, які захоўваецца і сёння. Цырымонія адкрыцця ў Альбервілі праславіла на ўвесь свет французскага рэжысёра Філіпа Декуфле. Ён зрабіў тое, што да яго не рабіў ніхто: аб'яднаў у адну пастаноўку танцавальных акцёраў, цыркачоў, акрабатаў, спарцменаў і музыкаў. Усё гэта суправаджалася

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

грандыёзным светлавым шоў. Велізарнае ўражанне на гледачоў зрабіла з'яўленне французскай эскадрыллі, якая пакінула ў небе рознакаляровыя алімпійскія кольцы.

Зімовая Алімпіяда 2002 г. Солт-Лэйк-Сіці (ЗША) характарызавалася відовішчнасцю, яркасцю цырымоніі адкрыцця, багаццем феерверкаў і спецэфектаў. У праграме было грандыёзнае лядовае шоў па матывах гісторыі першых перасяленцаў з Еўропы. Арганізатары ўключылі ў праграму цырымоніі ўнсення амерыканскага сцяга (яго належыць падымаць на Алімпіядзе, згодна з хартыі), знойдзенага на руінах гандлёвага цэнтра ў Нью-Ёрку, як даніна памяці трагічных падзей 11 верасня 2001 г. Адкрываў Гульні Джордж Буш, а спартыўны комплекс Rice-Eccles Olympic Stadium, які змяшчае каля 45 тысяч гледачоў, быў цалкам запоўнены. Завяршылася шоу выступленнем Стынга з кампазіцыяй Fragile.

Цырымонія ў Турыне 2006 г. (Італія) праводзілася пад лозунгам “Тут жыве запал”, што пераканаўча пацвярджалася удзелам Сафі Ларэн ў шэсце з алімпійскай паходняй. Алімпіяда дала каласальны штуршок развіццю горада - было пабудавана 65 спартыўных пляцовак, стадыёнаў, спартыўныя вёскі для атлетаў і журналістаў. Спецыяльна да Алімпіяды ў Турыне быў з нуля пабудаваны метрапалітэн, што само па сабе з'яўляецца беспрэцэдэнтным падзеяй. Арганізатары паставілі рэкорд, яны збудавалі самую высокую алімпійскую чашу за ўсю гісторыю Гульняў (57 метраў).

“Сціпла, але з сэнсам”, –так эксперты ацанілі пастаноўку цырымоніі адкрыцця Гульняў 2018 г. у Пхёнчхане, атрымаўшых назву “Усходняя казка”, мастаком-пастаноўшчыкам відовішчнага шоу з нацыянальным каларытам стаў Ен Юн Вун, рэжысёрам - Сон Сын Хван. Цырымонія адкрыцця ў Пхёнчхане апынулася ў цені таго дзейства, што было прадстаўлена на Алімпіядзе ў Пекіна-2008, таму ў Пхёнчхане цырымонія адкрыцця выглядала вельмі стрымана. Усё было досыць традыцыйна – і фігуры міфічных жывёл, і роставыя лялькі. Цырымонія адкрыцця на ўсіх апошніх зімовых Алімпіядах праходзіла на закрытых стадыёнах, а ў Пхёнчхане арганізатары адважыліся пасадзіць 35

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тысяч чалавек пад адкрытым небам (прытым што чакалася паніжэнне тэмпературы паветра да дваццаці градусаў марозу), у гэтым арганізатары відавочна эканомілі, бо стадыён пасля Алімпіяды быў разабраны. Сама цырымонія адкрыцця Алімпіяды адбылася на пяцікутнай арэне дыяметрам 72 метра, пяць трыбун, размешчаныя пад пэўным вуглом, сімвалізавалі экалогію, культуру, забеспячэнне міру, эканамічнасць і стаўку на перадавыя інфармацыйныя тэхналогіі. Мастак-пастаноўшчык выкарыстоўваў старажытны міф: пяць дзяцей трапляюць у пячору, сустракаюцца з міфічнымі жывёламі і птушкамі, далей дзеці, з старажытнасці трапляюць у сучасны, футурыстычны свет, які ім, уласна, і будаваць. У фінале яны бачаць вежу свету. Карэя, такім чынам, пасылае ўсім паведамленне, што сучасны свет трэба берагчы. Трэба адзначыць цікавую тэхнічную задумку – увесь алімпійскі стадыён быў ператвораны ў святлодыёдны экран, па ўсім перыметры стадыёна можна пісаць і даваць карцінкі.

Цырымонія закрыцця Алімпійскіх гульняў ў 2014 г. у Сочы праходзіла на стадыёне «Фішт» і прысвячалася рускай культуры. Рэжысёр Даніэле Фінцы Паска, які далучыўся да каманды расійскіх прафесіяналаў у якасці рэжысёра-пастаноўшчыка, галоўны крэатыўны дырэктар – Канстанцін Эрнст. Самая маштабная Цырымонія закрыцця за ўсю гісторыя зімовых Гульняў, таму што ў пастаноўцы прынялі ўдзел больш за 7 000 чалавек, выраблена больш за 43 000 дэкарацый. Назва цырымоніі закрыцця – ―Дасягаючы немагчымага”, распавяла пра культурную спадчыну краіны. Сюжэтная лінія Цырымоніі звярнулася да мастацкіх творах, музыкі, балета, літаратуры і цыркавога мастацтва. Пастаноўка складалася з 14 кірункаў, кожная з якіх прадстаўляла сабой асобнае шоу. Галоўным дэкарацыйнае элементам закрыцця стаў святлодыёдны «лес», які ўяўляў сабой аб'ект з 204 светлавых трубак вышынёй 12 метраў кожная. На працягу ўсяго шоў «лес» мяняў свой колер, ствараючы патрэбную атмасферу. Калі на табло загарэўся «нуль», святлодыёдны лес у цэнтры поля выбухнуў яркімі фарбамі, а над дахам стадыёна асвяціўся салют.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Першы нумар – гэта танец на калясках. Танцоры выступаюць разам з паветранымі гімнастамі. Пастаноўшчыкі нумары хацелі перадаць, што часта людзі, якія не могуць хадзіць, ўмеюць лётаць і лунаць над праблемамі. Кульмінацыйным момантам цырымоніі стала сцэна згасання Алімпійскага агню. Талісманы «Сочы 2014» - Белы Мішка, Зайка і Леапард - і маленькія героі – Люба, Юра, Валя – праехалі па заледзянелую мора на лыжах, каньках і сноўбордзе ў пошуках Алімпійскага агню. У фінале шоу Белы Мішка, пад гукі рэміксу вядомай мелодыі Эдуарда Арцем'ева і знакамітай песні Аляксандры Пахмутавай «Да пабачэння, Масква!» Затушыў Алімпійскі агонь, сімвалізуючы сувязь алімпійскіх пакаленняў.

Такім чынам, навейшыя тэхналогіі ў галіне крэатыўнага асвятлення і праекцый, уключэнне мясцовых непаўторных ідэй і вытрымліванне асноўнай задумы, даюць магчымасць стварыць сапраўднае свята для гледача, таму цырымоніі адкрыцця і закрыцця маштабных спартыўна-відовішчных мерапрыемстваў прыцягваюць велізарную тэлевізійную аўдыторыю і становяцца аб'ектам найбольшай канцэнтрацыі ўвагі сусветнай супольнасці.

---

1. Петров, Б.Н. Массовые спортивно-художественные пред- ставления (Основы режиссуры, технологии, организации и методики) / Б.Н. Петров. М. : СпортАкадем Пресс, 2001. – 352 с.

2. Репникова, Е.А. Основы технологии организации спортивно-зрелищных ме- роприятий / Е. А. Репникова. Владимир : Изд-во ВлГУ, 2015. – 88 с.

3. Черняк, Ю.М. Режиссура праздников и зрелищ / Ю.М. Черняк. – Мн., «Тетрасистемс», 2004. – 224 с.

4. Шетенбах, В. Век Олимпийский / В.Шетенбах. – М., ТЭРРА-Спорт. Олимпия – Пресс, 2002. – 247 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ